Рэй

Субота,
3 чэрвеня
2017 года

КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ДАДАТАК ДА "НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕТЫ"



На выставе "Цвіценне" робіцца радасна і дзецям, і дарослым.



Кіраўнік студыі "Зебрык" Вікторыя Камарова дзякуе дырэктару галерэі "Універсітэт культуры" Паўлу Сапоцьку за супрацоўніцтва.

# Расцвітаць павінны найперш мы самі...

Днямі ў сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" адкрыўся міжнародны арт-праект "Цвіценне", прымеркаваны да Дня абароны дзяцей. Праект сабраў работы дзяцей і падлеткаў з Беларусі і Расіі. Ад нашай краіны гэта навучэнцы мінскай мастацкай студыі "Зебрык", а ад Расіі — мастацкай студыі "Аловак" (Колтушы) і мастацкага ліцэя № 1 (Петразаводск).

Усіх іх натхніць, па задуме арганізатараў, павінна была творчасць Сальвадора Далі, а калі дакладней, сваімі творамі яны павінны былі адказаць на вельмі сюррэалістычнае пытанне ў духу Далі: "А што, уласна кажучы, можа расцвісці такога, што расцвісці не можа ў прынцыпе?"

Вось і "расцвітаюць" у творах удзельнікаў праекта металічныя замкі, крэслы, прасы, электрычныя лямпачкі і іншыя, зусім не прыдатныя для расцвітання прадметы. Але, безумоўна, над усім гэтым мастацкім сюррэалістычным цвіценнем стаіць метафара — расцвітаць павінны найперш мы самі, каб радавацца жыццю самім, каб радаваць іншых людзей, каб цвіценне, а не завяданне панавала ў нашым свеце.

Лета пачалося, квітнее...

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**



Марына Псышчаніца (Беларусь). "Папіў вадзічкі..."



Ангеліна Царагародцава (Беларусь). "Два водары".



Арына Стрыфель (Беларусь). "Вогненныя кветкі".



Марк Бернар (Беларусь). "Каменныя джунглі".



Наталля Булаўкіна (Расія). "Дрэва жыцця".

## Нацыянальная літаратурная прэмія — гэта не самамэта, а справа гонару нашай літаратуры

*Ад беларускіх пісьменнікаў чакаюць цікавых арыгінальных твораў*

*Стар. 11*

## "Трэба цаніць найперш сваё, а на чужое глядзець вельмі ўважліва, разборліва і асцярожна..."



*Суботні госць — віртуоз-акардэаніст, спявак і кампазітар Ігар Квашэвіч*

*Стар. 12—13*

## Прызнанне ў любові дасканаламу чалавеку



*У галерэі "Лабірынт" НББ адкрылася выстава сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў "Грані творчасці"*

*Стар. 14—15*

## Што ў тваім значэнні, слова?

*Пабачыў свет "Школьны слоўнік беларуска-рускіх амонімаў"*

*Стар. 16*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ